Ніна Пучык

# Маленства благаслаўлёны край…

Вершы

Кобрын

Цэнтральная раённая бібліятэка

2018

ББК 84(4Беі) 6-5
П 91

***Складальнікі:***

*Т. А. Качан* – бібліятэкар II катэгорыі Стрыгаўскай публічнай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

*С. Д. Курачук* - галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

***Камп'ютарны дызайн вокладкі:***

*П. С. Грыневіч* – інжынер-праграміст цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

**Пучык, Н.** Маленства бласлаўлёны край… : вершы / Ніна Пучык ; складальнікі : Т. А. Качан, бібліятэкар II катэгорыі Стрыгаўскай публічнай бібліятэкі, С. Д. Курачук, гал. бібліёграф цэнтральнай раённай бібліятэкі ; камп'ютарны дызайн вокладкі : П. С. Грыневіч, інжынер-праграміст цэнтральнай раённай бібліятэкі. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2018. – 40 с.

# Пасля навальніцы

Адгрымела навальніца за ваколіцай,
Раскаціліся маланкі над зямлёй,
Льюцца , скачуць раўчукі –свавольнікі,
Пыркі рассыпаюць за сабой.
Хмарка, страсянуўшы свае крылы,
Апусцела без маланак і грымот.
Паляцела, пустацелая, паныла
За запасамі вады за паварот.
Глянула ўніз і сыпанула
Жменямі дажджу на сенажаць.
Ажыла, павесялела і шнурнула
Каляровую вясёлку ўнеба гладзь.

# Учарашні дзень

Вечарэе… Дзень скаціўся за пагорак.
Паляцеў, махнуўшы нам крыламі.
Заўтра будзе называцца ён “Учора”,
А сягодня яшчэ з намі, яшчэ з намі.
Няўжо цяпло сягонняшняга дня
Таксама стане ўчарашнім.
І ёсць, напэўна, у тым мая віна,
Што ўсё ў мінулым, як той ліст апаўшы.

Толькі дзесьці ў нейкай бяссонніцы
Усё да дробзязў раптам успомніцца,
І шчымлівасць у сэрцы журботная
Заспявае мне песню тугі,
Праз дні ўчарашнія, самотныя
Усплывае вобраз дарагі…

## Надзея

Прыціх валацуга – вецер,
На хвілінку прылёг адпачыць:
Вандроўкі па цэлым свеце
Любога могуць змарыць.
Ах, гэты свавольнік-вецер,
Ён зноў мне прынёс тугу.
Скуголіць, махае веццем,
Крычыць мне, што я змагу…
Адолець змагу перашкоды,
Змагу разагнаць бяду,
Разбурыць магу крыгаходы,
Любую напасць адвяду.
Ах, вецер-свавольнік, свавольнік
Ну, хопіць са мной жартаваць.
Сам ведаеш, што ўжо ніколі
Такой, як раней не бываць.
Але, я ўсё ж удзячна, вецер,
Што ты зноў мне даеш надзею

На шчасце, на радасці квецень,
На заўтрашні светлы дзень.

## Маёй школе...

Нязвыклая ціша на школьным двары,
Не кліча званок на ўрок.
Без смеху і гоману дзетвары
Тут час запавольвае крок…
Здаецца, бачу школьных сяброў,
Настаўнікаў родныя твары.
Здалёку ўсплываюць у памяці зноў
Надзеі дзяцінства і мары.
Стаяла драўляная школка
Якраз насупраць царквы.
І здавалася, што над ёю
Не будзе ценю бяды.
Дзясяткі яе выхаванцаў
Штогод вылятalі з гнязда
Жыць, марыць, вучыцца, змагацца
Кахаць і дзяцей гадаваць.
Неперспектыўнай здалася
Камусьці школа мая
Над ёю навісла навала,
Пад ёй задрыжэла зямля.
Разлілася над роднаю школай

Густая, густая бяда.
І выраслі ў светлых класах
Дзядоўнік і лебяда.
Як помнік людскому бяздушшу
Стаіць цішыня і тлен
І небыццё раніць душы
Тым, хто вылецеў з гэтых сцен.
Асірацела вёска з прыгожаю назвай Бяроза,
Матыў на высокай ноце надрыўна гучыць тугой.
Асеннім дажджом ціха сыплюцца слёзы,
І час не сцірае нашай памяці боль.

## Асенняя непазбежнасць

Заблудзілася восень у трох соснах,
Ціхенька прысела пад ялінкай.
Рыжыя расплеценыя косы
Падвязала залатой хусцінкай.
То насупіць бровы, то смяецца,
То закружыць у каляровым вальсе,
Сыпане лістотай і, здаецца,
Час ляціць па велізарнай трасе.
Ліст мядзяны з залатым адлівам
Кружыць у віхурным танцы.
У апошнія свае хвіліны
Хочацца шчаслівым яму здацца.

Мо таму ты, восень, так паспешна
Насыпаеш фарбаў нам уволю,
Каб святая гэта непазбежнасць
Адбылася мякка і без болю.

## Бяссонніца

За начнымі вокнамі носіцца бяссонніца,
Чорнае крыло – нараспрасцяг.
Стукае, грукоча ў дзверы,
Просіцца да раніцы застацца ў гасцях.
Сыпане, як хмара, градам успамінаў,
Залівіста рагоча ўначы.
І лётае са з’едліваю мінай,
Сэрца гэтым рогатам рвучы.
Ты не рві мне душу ўспамінамі,
Што было, я ведаю сама.
І за кожную жыццёвую правінаčку
Заплаціла ўжо даўно спаўна.
А што там за новым паваротам
Ты не скажаш мне, крычы ці не крычы,
А аб страхах, няўдачах і турботах
Чорная бяссонніца, маўчы.

# Ластаўкі пад стрэхай

Ёсць добрая прыкмета ў народзе:
Калі пад стрэхай ластаўка саўе гняздо,
У гэтым доме радасць карагодзіць
І прылятае з імі шчасце ў дом.
Каторы год пад стрэхай майго дома
Будуюць ластаўкі сваё жытло,
А мне дагэтуль так і невядома,
Ці называцца шчасцем усё магло
Я спадзяюся, што вясной адметнай
Вярнуцца ластаўкі да нас усёадно.
У рэшце рэшт падцвердзіцца прымета,
І шчасце зазірне ў маё акно.

# Зноўку лёс падставіў мне падножку…

Зноўку лёс падставіў мне падножку,
Збоку пазірае: што ж зраблю?
Ці ў адчаі рукі заламаю,
Ці ў роспачы звалюся на зямлю.
Часам так бывае, што здаецца,
Лёс той , як віно на палыне.

Цёмнае, цяжкое беспрасвецце
Неба пасылае зверху мне.
Але веру я, што час настане,
І, ўвабраўшы сілы з небыцця,
Я паўстану з попелу ўранні
Вугальком гарачым да жыцця.

## Прысвячаецца Т.

Маладая, шчырая, прыгожая…
Не да твару ёй слова «ўдава».
Ды начамі чорнымі, трывожнымі
Сівее ад самоты галава.
Дзве яе крывінкі, два сыночкі,
Дзве яе апоры, дзве надзеі
Ужо даўно гадуюць сваіх дочак,
А яна ж чакае дзень у дзень.
У пустым, чыста прыбраным доме
Адзінота свой святкуе боль.
Ці была шчаслівай – невядома…
Страшна й азірнуцца і зірнуць удаль.
Жыве надзея ў сэрцы горкім,
Што шчасце трэшчынкі загоіць,
Што з неба нясмелая зорка,
Як светлячок, заляціць.
Золак дзівосны, святлісты

Аднойчы ўранні разбудзіць
І з цёплым ветрам смалістым
Самота яе адбаліць.

## Дзве адзіноты

У дождж і град, мароз і вятры,
І ў белы пушысты сняжок
Крочаць разам сівы стары
І чорны калматы Дружок.
Ім цёпла і добра заўсёды ўдвох
Ісці нетаропка дадому,
У іх чысты і светлы, утульны дамок,
Дзе так непрыветна самому.
З кожнага куточка ў драўляным доме
Холадам сцюдзёніць адзінота.
Але разам сэрцы – старое і малое,
І адступае прэч тужлівая самота.
Дружок глядзіць на сябра дарагога,
А прадчуванне выклікае жах.
Бо асвятляе свечка апошнюю дарогу
У родных халадзеючых руках.
З тых пор прайшло нямала дзён ужо.
Стаіць самотна дом асірацелы
І сэрцам вялікім маленькі Дружок
Чакае сябра ў садзе апусцелым.

Звярнуўшыся ля веснічак, як гномік,
Прысніў ён, што ў адну з начэй
Яго аклікнуў голас, той знаёмы,
І слёзы пакаціліся з вачэй…

## Запозненае раскаянне

Каторы раз у мой трывожны сон
Прыходзіць дом бацькоў, драўляны хорам.
Пустымі шыбамі зачыненых вакон
Глядзіць у душу мне з нямым дакорам.
        Слязінкі капаюць са смольнага бярвення,
        Спарыш з трыпутнікам падмурак абвілі
        Тугога сонца зыркія праменні
        Цягучым золатам кладуцца на зямлі.
З пілаваных дошак сцены, як экраны,
Высвечваюць жыццёвыя імгненні:
Каханне, слёзы, смех і сэрца раны
Калейдаскопам колераў струменяць.
Даруй мне, родны бацькоўскі куток,
        Што павялі мяне жыццёвыя дарогі,
        Што не хапала часу, каб глыток
        Паветра роднага ўдыхнуць мне ля парога.
        Даруй, што ў дом я прыязджала госцяй,
За ачарцвеласць ты маю прабач,
Што каля веснічак пустых згубілась штосьці,

Што каля ганку зноў спявае вецер,
А ў маім сэрцы спеў гучыць, як плач.

## Патаемная надзея

У бясснежны снежаньскі вечар
Невыносны, доўгі, як год.
Адзінота кладзецца на плечы
І пранізвае навылёт.

Неадліпная адзінота
Кожны вечар пляцецца ў мой дом.
І супраць гнятлівай самоты
Я п'ю ўспаміны нагбом:

Па снегу хрусткаму і мяцельнаму
Мы беглі насустрач шчасцю
Вокамгненнаму і хмельнаму,
Не верачы ў напасці.

А шчасце было палавінным,
Пакутлівым і зыбучым,
Няўлоўным і нейкім прывідным,
Як белы пясок, сыпучым.

Успамін той прыемна-балючы
Грэе дом мой ў тужлівы вечар.
І чароўным бальзамам гаючым
Бяскрылую душу лечыць.

Знікаюць кудлатыя цені,
Позні месяц у акно зазірнуў.
Разбіваюцца ўшчэнт сумненні –
Патаемнай надзеяй жыву…

## Святло надзеі

Надакучлівы дождж і слота…
Цягучы світанак ніяк не разгоніць туман,
Ад  ракі пацягнула маркотай,
Гаспадарыць касматы падман.
Нявеtла зямля зазірнула
У шэры купал нябёс.
І раптам надзеяй дыхнула
Праз усхліпы дажджыначак – слёз.
Калі жыццё гаркотай палыновай
Штораз схіляе галавы нам ніц,
Святой надзеяй, жыватворчай, новай,
І верай непахіснай трэба жыць.
І з-за хмар неабдымных, панурых,
Узмахнуўшы тугім крылом,
Абрыне нам неба дарунак –
Барвовае раскошнае святло.

# Памылкі

Не бывае людзей без памылак,
Непазбежных расчараванняў.
Не бывае жыцця без ухмылак
І бясплённых намаганняў.
Бяжым па жыццю, спатыкаемся,
Сінякі сабе набіваем.
Памыляемся, памыляемся
І спрадвеку праўду шукаем.
Не баюся памылкі адзінай,
Тыповай і выпадковай,
Памылкі дробнай і выбачальнай.
Лёс мой, не дай мне – фатальнай.
Засцеражы маіх родных,
Засцеражы маіх блізкіх
Ад памылак неверагодных.
Ад памылак ганібных і нізкіх.

# Першароднай чысцінёй пялёсткаў белых…

**П**ершароднай чысцінёй пялёсткаў белых
Сыпануў вясновы хмель нам май,
І з каханнем светлым і нясмелым

Ён павёў нас у таямнічы край.
Павялі дарогі нас нязнаныя
Насустрач шчасцю крокаму й няўлоўнаму.
То сустрэчы, то расчараванн
Ды так і не знайшлі галоўнага.
Разышліся с табою
На апошняй мяжы.
Без адчаю і болю –
Лёс крутнуў віражы.
Зімы змяняліся вёснамі,
Шызы шэрань прыпудрыў нам скроні.
Скрозь вятры і мяцеліцы злосныя
Адчуваем цяпло далоняў.
Мы засталіся ў тым чароўным маі,
Што закружыў нас кветкавым убраннем,
У зямным непрыдуманым раі
І ў першым бязгрэшным каханні.

## Вясковыя сны

Пагаслі ліхтары на сонных вуліцах,
Вёска патанула ў цішыні.
Туман грывасты на галінках туліцца
Ды зоркі мігацяць ўдалечыні.
Спавітая гаючым сном
Заснула вёска аксамітнай ноччу.
Накрытая раскідзістым крылом

Дабра і шчасця сваім людзям хоча.
Сніцца хлебаробам залатая ніва,
Высакародны колас гнецца да зямлі.
Натруджаныя рукі іх руплівыя
Спрадвек шчыруюць на святой  раллі.
Выспелы вусаты, паўнаважкі колас –
Узнагарода лепшая для іх.
Роднае зямліцы звонкі, чысты голас
Дзіўнаю мелодыяй радуе ім слых.
Ледзьве першы промень світанковы
Жыватворнае цяпло абрыне на палі.
Расплюшчыць вёска вочы валашковыя
І прывітае шчодры дар зямлі.

## Школьны фотаздымак

Чорна-белы фотаздымак на сцяне.
З бесклапотным шчасцем маладосці
Быццам завіталі да мяне
Аднакласнікі мае ў госці.
Гарэзлівыя мары ў вачах,
Надзеі рамантычныя ў сэрцах.
І яшчэ непратаптаны шлях,
Дзе з жыццём нам прыйдзецца сустрэцца.
Першым нерастрачаным каханнем
Свецяцца пылаючыя вочы,

І толькі чыстае, як неба, пажаданне:
Застацца ў чэрвеньскай кароткай ночы.
Не зразумець было нікому з нас у той час,
Што кожнаму рыхтуе лёс дарогу,
Поўную і смутку, і святла, і праз,
Нібы напятая струна, трывогу.
На фотаздымку яшчэ ўсе, яшчэ ўсе разам.
І не гнятуць ніжэй зямлі пакутлівыя страты.
Сябры мае без пустадумных фраз
Яшчэ жыцця свайго адлічваюць даты.
І хоць прайшлі імклівыя гады,
Яшчэ не хочуць ведаць цішы нашы сэрцы.
Бо застаецца з намі назаўжды
Святая сіла школьнага братэрства.

## Таропкая вясна

Яшчэ далёка да вясны ружоватварай,
Яшчэ гнілая і бясснежная зіма
Нудзіць і стогне, сіза-шэрай хмарай
Шпурляе змрок кудлаты, хоць дарма.
Залётныя вятры без жалю гнуць рабіны,
Скуголяць беспрытульныя, хаваючысь ў бары.
Сівы знямоглы вечар па драбінах
Узабраўся і заснежыў ліхтары.
Праз завыванне лютаўскай завеі

Усё часцей прыходзіць у сны вясна.
І верыць хочацца, што ў снежнай каруселі
Надзеі й сілы не расстрачаны да дна.
Хоць вецер яшчэ дыхае сурова,
Але ўжо над золкаю зямлёй
Павеяў водар хмельны і чароўны
Вясны прасветлай, гулкай і жывой.
На жаль, як сто і болей год назад.
Вясна дзяўчом светлавалосым,
Як бы між іншым, кіне свой пагляд
І заспяшаецца ў калінавую восень.

## Сцяжынка ў дзяцінства

Воблакі пуховыя па нябеснай сіні
Плывуць удаль над родным маім краем.
Сняжком блакітным і зіхоткім інеем
Ялінкі тонкаверхія  зайгралі.
Заснежанай сцяжыначкай рыпліваю
Бягу гарэзлівым дзяўчом у дзяцінства час.
Бягу ў гады зялёныя, імклівыя
І мару акунуцца ў іх хоць раз.
Танклявыя дзяўчатак галасы,
Пагляды сарамлівыя раз-пораз.
І чую праз няўмольныя часы
Гартанны хлапчукоўскі голас.

Белагрывая гарэзная мяцеліца
Замяла ўсе сцяжынкі ўздоўж сяла
Разумею , што маленства ўжо не вернецца
З той дарогі, што ўдалеч павяла.
З горкі нашай ледзяной, вадой палітай,
Унукі імчаць на санках з вышыні.
Замыславатаю мелодыяй накрыты
Лясок за сажалкай, у настылай цішыні.
І я ў той міг прасветлены, адзіны
Абвострана адчую сэрцам усім,
Што той куток маленькае Радзімы
Заўсёды будзе самым дарагім.

## Узлёты і падзенні – ўсё адносна…

**У**злёты і падзенні – ўсё адносна:
То асляпляльная ўсмешка, то насмешка
Недаравальная здаецца невыноснай,
То лёсу смех – дзіцячаю пацешкай.
То раптам тугою палыновай
Зацягне алавяны небасхіл.
І хмары  наплываюць знову й знову,
Гугняць мне штосьці голасам глухім.
То дзесьці ў асляпляльнай сіняве
Жывільны промень сонца лашчыць сэрца.

І белаю надзеяю жыве
Мая душа – ўрэшце рэшт сагрэцца.
Усё ж я паўтараю зноў і зноў:
Калі жыццё здаецца невыносным,
То неадносны толькі Вера і Любоў.

## Вясновы холад

Жаўцеюць на вярбінах каташкі,
Сасонкі лашчыць сонечны прамень.
А праз заснежанае поле, напрасткі,
Шыбуе ўжо вясновы светлы дзень.
Капёж  тармошыць сонную вясну.
Памыўшысь, сонца выплыла з-за хмары,
Бы адчуваючы за халады віну,
Над золкаю зямлёю гаспадарыць.
За ваколіцай своволіць цёплы вецер,
Засумаваў сняжок ад гэтакіх наскокаў.
Хоць і вясна, а мне чамусь здаецца,
Што зажурылася ўсё навакол.
Ды той пранізлівай пралескавай журбою,
Што пасылае мне нязбытную надзею:
Мо замяце чаромхай нас з табою,
Як у той вясновы незваротны дзень.
Зацерушыла, замяло палёсткамі.
Здалося мне – цвіце спакусны сад.

Ды словы твае, ціхія і жорсткія,
Сыпанулі колкім снегападам.
Цябе пакінула ў пялёсткавай вясне,
Сама заснежанай дарогаю пайшла.
І ў празяблым свеце так ясна стала мне,
Што дарыш холад ты замест цяпла.

## Пялёсткавая замець

Зноў пялёсткавая замець за акном
Вясновай верай у цуд усё засыпае.
То абнадзеіць, як калісь даўно,
То, як калісь, надзею забірае.
Бязмежнасць у той вясенняй крутаверці,
Пялёсткаў адурманьваючы пах.
Адкінуць усе сумненні і паверыць?
Ці зноў застацца ў няспраўджаных тых снах?
А на душы неяк дзіўна хараша:
Рассыпае вецер пялёсткі,
І  сляды пазалеташняй горычы
Замяце, апрануўшысь наросхрыст.
Белапеннай вэлюмнай беллю
Замяце хай тыя  хвіліны,
Дзе не я стаяла ў вясельным,
І не ты стаў шчасцем адзіным.
Легла замець на скроні даўно.

На каго і на што наракаць?
Абнадзеіцца хочацца зноў.
А пялёсткі ляцяць і ляцяць…

## Святло бяроз

За аксамітным полем – бярозавы лясок,
Нібы працяты першароднай белізной.
Пралескавых званочкаў галасок
Кліча наталіцца чысцінёй.
Можа ў бярозках белакорых,
Спаласнуўшых ногі ў расе,
Пад зялёным ветразем у прасторы
Заблукала шчасце пакрысе.
Ступаюць ціха басанож бярозы
Па першай сакаўной траве.
Няўлоўным шчасцем пахне вербалоззе,
Цнатлівая надзея тут жыве.
І тым святым бярозавым святлом,
Напэўна, мне і век не наталіцца.
Тут родны кут і родны дом -
Жыцця майго гаючая крыніца.

## Прадчуванне восені

**П**радчуванне восені ў прыродзе:
Па верасах шумяць дажджы часцей,

Часцей вятры-задзіры карагодзяць,
Бялява-малады туман у палях-гусцей.
Яшчэ зацішна на душы і ў сэрцы светла,
Крыштальнай чысцінёю – неба просінь,
А кветкі раніцай ужо глядзяць няветла:
Рабінай стройнаю крадзецца восень.
Асенні халадок – яшчэ не слота,
Яшчэ цвітуць вяргіні пад акном.
Яшчэ не захлынула душу мне маркотай,
Яшчэ не п’ю трывогу я нагбом.
Стараюся назад не азірацца.
Крадзецца восень? Гэта ж не бяда.
Пара ж жыццёвай мудрасці набрацца,
Хоць усё ж такі мне нечага шкада…

## Матуліна навука

Як соладка ходзікі цікалі
На сцяне ў бацькоўскай хаце,
Калі на сняданак клікала,
Ціхенька ступаючы, маці.

Каб былі сухімі вочы ў матулі,
Усе трывогі ў сэрцы берагла.
І калі вятры віхурныя падулі,
І калі ад слёз заснуць я не магла.

Набіралася трывання й сіл сама,

Падкову шчасця-долі на мяжы шукала.
Хавала часам роспач я дарма:
Матуля ўпотай слёзы выцірала.
	Не раілась з табою ні аб чым,
	Здавалась мне, цябе тым берагу.
	Прашу парады зараз, але ты маўчыш,
	І ў вочы родныя я глянуць не магу.
Мне б прысніць матулю каля поля
З доўгаю чарняваю касой,
З духмянымі суніцамі ў прыполе,
З валошкамі, абмытымі расой.
	Рассыплюцца валошкі па траве,
	Ледзь працягну ў сне да іх я руку,
	Нібы матуля знак мне падае,
	Каб шанавала я яе навуку.
Усё, чым ты, матуля, адарыла,
Я не расстрачу ў жыццёвай мітусні.
Я ведаю, што птушкай белакрылай
Ты назіраеш там за мною з вышыні.

## Маленства блаславёны край…

Сцяжынка ўздоўж поля васількова
Бяжыць расой краплістаю, згубіўшысь у палыне.

Былінкай гнуткай, позіркам дакорлівым
Дадому кліча вёсачка мяне.
Завядзі мяне, сцяжынка, як калісьці
На сунічную паляну ў Божы Дар.
Дай там водарам магічным наталіцца
І спакоем, як жывільная вада.
Сунічнік той на ўзгорку невысокім
Пазёмкамі матуля называла.
Бо зямля паіла шчодра сокам,
Гаючай сілай гронкі налівала.
Зарасніку бэзу аддам усе трывогі,
Знайду прытулак там нязДзейсным надзеям.
Засыпанай пялёсткамі дарогай
Прайдуся па жыцця свайго падзеях.
Белая замець бэзу духмянага
Белай надзеяй вярэдзіць да слёз.
З ільнянога поля палатнянага
Вытканы маёй дарогі лёс.
Маленства бласлаўлёны край,
Прабегчысь дай па лугавым кіліме,
Прыпасці зноўку да крыніц дабра,
Адчуць сябе часцінкаю Радзімы.

## Дарогі

З першага кроку ад роднага дома
Пачынаюцца ўсе дарогі.

Ці шчаслівыя, - лёсу вядома, -
Ці напоўненыя трывогай.
Ціхім крокам насустрач марам,
Што здаліся святымі з сьвяцейшых,
Шла нясмела ў дарожным марыве
І надзеямі сэрца цешыла.
«Не спадзявайся, а ідзі», - казалі мне
Бязмежныя й бясконцыя дарогі.
І павярталі да бацькоўскага парога,
Дзе сум блакітных незабудак у акне.
У агародчыку гаючы водар мяты
Развярэдзіў мне да слёз душу.
І сцяжынку росную да роднай хаты
На ўсіх дарогах у сэрцы я нашу.

## Хоць усхваляў Бальзак узрост жаночы…

**Х**оць усхваляў Бальзак узрост жаночы,
Ды вельмі памыляўся ён, відаць.
Бо ўжо не так гараць жаданнем вочы,
А дні не йдуць, а шэрыя, ляцяць.
Прытомленай усмешкай не зваблівац вусны.
З-пад брывоў крылатых журыцца пагляд.
Вячэрняю парой ужо няма спакусы

Да раніцы забрацца ў вішнёвы сад.
Хоць мне шкада, што неўзаметку
Бягуць імклівыя гады,
І ў адцвітанні ёсць свая прыветнасць:
Ісці жыццём спакоем няспешнае хады.

## Роздум у дзень нараджэння

Перагорнута яшчэ адна старонка
У змястоўнай кнізе пад назвай "жыццё".
Дзён маіх палячэла скарбонка
І карацей дарога ў небыццё.
Што там? Што там? – спрадвечнае пытанне…
Пытаю ў матулі, што прыйшла ў мой сон.
Але ў адказ толькі журботнае маўчанне
Ды зорак у небе ціхі перазвон.
Нічога не змяняецца ў свеце…
І колькі бы стагоддзяў не прайшло,
Усё спадзяемся, што ў жыццёвай крутаверці
Дабро заўсёды пераможа зло.
Мой шлях далягляд таемны
Ужо не здаецца доўгім і далёкім.
У сынах я паўтаруся кожным геным.
Вярнуся імі з незваротнае дарогі…

## Калінавыя пацеркі

Куточак мой – пахучы куст язміну,
Што красаваў за студняй у двары.
І на ўзмежку пацеркі каліны,
Рассыпаныя ветрам без пары.
Слязой рубінавай у траве, за полем,
Калінавыя пацеркі гараць.
Маўклівым плачам, безвыходным болем
Пад хрусткім інеем, настылыя, гарчаць.
Рубінавыя пацеркі з каліны
На снегавым карункавым абрусе.
І шчасця гаркаватага хвіліны,
І сок з гарчынкаю на нашых хмельных вуснах.
Калі ж аднойчы вярнусь я туды,
На родны ўзмежак, дзе расла каліна,
Стаіўшы горкі ўздых, знайду сляды
Таго, што захлынулася між нас. Ці затаілась?

## На бацькоўскім падворку

На бацькоўскім падворку доўга моўчкі стаю,
Цішыня і самотнасць раняць душу маю.
Успаміны вітаюць над прыціхлым садком:
Вось матуля сівая з сырадою вядром,
Бацька выйшаў насустрач, усміхаецца мне,

І сястрычкам ласкава, як заўсёды кіўне.
А півоні ля студні яркім цветам гараць,
За дамамі на лузе кліча зноў сенажаць.
Пах прывялай травы, пах язміну
Грэюць сэрца цяплом успамінаў.
І слязінкі на вейках дрыжаць…

## Асенні сад

Пахне яблыкамі ў асеннім садзе,
Лашчыцца антонаўка на сонцы,
І чароўны ап'яняльны водар
Льецца між галінкамі бясконца.
Праз усе жыццёвыя дарогі
Гэты водар побач йшоў са мною:
Перашкоды, буры і трывогі
Не здаліся з ім глухой сцяною.
Можа зноўку мне той сад прысніцца
І дзяўчынка ў ліставой завеі
Марыць,спадзяецца, што ў руцэ сініца
Лепей, чым у небе журавель.
Сыпле сад лістоту ў пазалоце,
Водар ап'яняе сіняву.
Надае мне сілы ў адзіноце,
І таму я веру і жыву…

# Васількавае поле

За вёскай на жытнёвым полі
Сінім полымем палаюць васількі.
Суцэльным дыванам сярод раздолля,
Як хвалі паўнаводнае ракі.
        Край поля зліўся з краем неба,
        І ў гэтай таямнічай сіняве
        Ёсць усё, што мне ў жыцці патрэбна,
        Што ў маім сэрцы марамі жыве.
Там чысціня душы, сардэчнасць
І дабрата людская, і любоў,
Жыццёвай мудрасці высокая спрадвечнасць
І шчырасць працавітых землякоў.
        Пранізлівая тая сінява
        Звініць у сэрцы звонам крышталёвым.
        Блакіт вачэй, глыбокіх,  як азёры,
        Жыве ў бясконцым полі васільковым…

# У навальніцу

Маланкі злосна паласуюць неба,
А гром зажодзіцца да хрыпаты.
У хвіліны гэтыя мне да болю трэба,
Каб захіснуў ад той навалы мяне ты.

І зноўку пасярод нянасця
Пытаннямі я непагадзь трывожу:
Мо ў крутаверці заблукала шчасце,
Прабіцца ў хмарах да мяне не можа?
Дыхнула ў твар дажджлівай прахалодай,
Чаму ж пякучасць нібы ад ляза?
Расстаннем вее палыновы водар.
У вочах дажджынкі. А ці то сляза?

## У чаканні зімы

Лес асенні застыў у чаканні:
Змрочна, сумна, няўтульна вакол.
Чорна-шэрыя дрэвы ў маўчанні
Пазіраюць зажурана ў дол.
Адзічэлы нахабнік вецер
Бессаромна сарваў лістоту
І засыпаў зламанае вецце
Пачарнелай ужо пазалотай.
Захіснуцца бы ім, схавацца
Ў белым покрыве цёплым, гаючым
І зялёнай вясны дачакацца
Пад сіверам ад ярасці балючым.
Прынакрыцца б сняжком глыбокім
І забыцца ў чароўным сне.
Аж да самай вясны яснавокай
Растварыцца б у белі

# Сябрам

Адыходзяць у нябыт сябры,
Дом будуюць сабе на пагосце.
Запрашаюць з тае пары,
Каб часцей заходзіла ў госці.
Я ў госці да вас не прыду,
Прыдзе час і прыду назаўсёды,
З вамі гутарку павяду
Пра жыццёвыя нашы прыгоды.
Пасялюся зусім недалёка,
Там, дзе час прыпыняе свой бег
І дзе неба высока, высока,
І дзе сонца плыве на начлег.
Недалёка, зусім недалёка,
Так, каб бачыць усіх родных сваіх
І сяброў, і суседзяў навокал,
Каб маліцца заўсёды за іх.

# Начныя хвіліны

Метраномам па падаконніку
Адстуквае дождж уначы
Хвілінам, спалохана сонным,
Думаючым ні аб чым.
Яны падаюць у такт з з даждджом,
Ляцяць у бездань сусвету

І мараць вярнуцца зноў
У начную санлівасць гэту.
Няўмольна бягуць імгненні,
Сплятаюць узор за узорам,
Насуперак усім законам
Мараць узляцець да зорак.
Але ні адной з хвілінак
Не суджана зноў паўтарыцца,
Ціха прыстаць на прыпынак
І новым жыццём заіскрыцца.
Выбягуць насустрач новыя хвіліны,
Стануць днямі, суткамі, гадамі.
А жыццё віруе безупынна,
Паўтараючы імгненні толькі снамі.

## Вясковыя красуні

Яшчэ зара свой першы промень прытаіла,
І разаспаўся ветрык лёгкавейны,
Вясковыя красуні ж клапатліва
Ужо шчыруюць нібы казачныя феі.
Сцяжынкай цераз поле напрасткі
Бягуць на фермы, даглядаюць статак.
А ў агародах градкі падраслі,
І клопат зноў, каб у хаце быў дастатак.

У будні й святы - праца навылёт,
Таму старэй за гарадскіх равесніц.
Настоена на веры, з году ў год,
Чакае іх каханне каля весніц.

Калі ж ім у люстэрка паглядзецца?
На тварах натуральны макіяж:
На шчочках цёпла сонейка смяецца,
І спелым коласам – каса. Вось весь візаж.

Адкуль у іх пагэтулькі святла?
Якая сіла чысцінёю сэрцы поўніць?
Сумленнем, мудрасцю й трываласцю сяла
Жанчынам абавязаны чароўным.

## Адна ў нас зямля і мова...

Кажуць, вершы на роднай мове
Непрэстыжна сёння пісаць:
У шыкоўных катэджах - панове,
Не да твару ім гэта чытаць.
Яшчэ ўчора вясковай вуліцай
Бегалі ўпрыскокі басанож.
Сёння ж у горадзе ім не спіцца:
У Анталью злятаць ці ў Ніццу?
Фанабэрыста сціснуўшы губы,
Растапырыўшы веерам пальцы,
Мову родную лічаць грубай

І жывуць, як краты й пастаяльцы.
Зразумець ім Богам не дадзена,
Што людская сіла ў каранях,
Што продкамі ў нас закладзена
Любоў да зямлі ў вяках.
Што роднай мовай, пявучай і звонкай,
Размаўляюць лясы і травы.
І з паднябесся песні жаваронкаў
Благаславенны край і мову славіць.
Адна ў нас зямля і мова.
Чаму ж душа ад душы далёка?
Няхай вас разбудзіць, сябры, панове,
Над вашым дахам буслінны клёкат.

## Асенні перон

Настойліва восень пастукае ў дзверы,
Як заўжды, без дазволу пераступіць парог.
Мне нашэпчуць балючыя слову няверу
Спахмурнелае неба і попельны змрок.
Растварыцца ў шэрым марыве перон.
Адводзіш моўчкі развітальны ты пагляд.
І адыходзіць зноў чужы цягнік, чужы вагон.
Замест жаданых слоў - зноў лістапад, зноў лістапад.
Адзінота на пустым пероне.
Б’е хлёсткі вецер, калючы і скразны.

Дзве рэйкі, спавітыя болем,
Бягуць у мае няспраўджаныя сны…

## Кожны дзень – маленькае жыццё…

Кожны дзень – маленькае жыццё.
І кожны раз надзея грэе сэрца,
Што час маркотны кануў у небыццё,
І можа ўрэшце рэшт душа сагрэцца.
Гартаю дзён мінулых каляндар,
Бягуць у памяці маёй, як на экране:
То выпадае радасць, то бяда,
То шчасце выблісне, то, як той снег, растане.
І тут нічога нельга перайначыць:
Распісаны ўсе дні да самай кропкі:
Жыць простым шчасцем – новы дзень убачыць,
Прайсці яго хадою нетаропкай.
Ды толькі хай сябры не растварацца
У імклівай крутаверці дзён.
Бо з часам толькі яны могуць выяўляцца,
Як выяўляе золата агонь.
Не адкладаю на выпадак больш важны
Ні слоў, ні спраў і ні сумненняў цень,
Бо кожны пражыты дзень, жыццё падкажа,
І ёсць той важны, непаўторны дзень.

# Баб’е лета

Апошнія кветкі зрываю ў букеты,
Лёгкакрылай завеяй мяце лістапад.
Адплываюць, дагарэўшы, фарбы лета,
Баб’ім летам белазорым поўняць сад.
Паветра звініць, як багемскі крышталь,
Ад нейкай балючай пяшчоты.
Пад сэрца падкоціць няпрошаны жаль.
Няўжо не адчуеш яго ты?
У асенняй дымцы раскашуе баб’е лета.
І хоць трыпутнік пры дарозе ўжо стыне,
Я ўсё яшчэ надзеяю сагрэта,
Што ўсё павернецца, зноў набяжыць, нахлыне…
І як назваць, мне невядома гэта,
Той неспазнаны і дзівосны ў сэрцы свет?
У чым таямнічасць бабінага лета,
Выратавальнай веры ў чым сакрэт?

# Змест


| | |
|---|---|
| Пасля навальніцы | 3 |
| Учарашні дзень | 3 |
| Надзея | 4 |
| Маёй школе… | 5 |
| Асенняя непазбежнасць | 6 |
| Бяссонніца | 7 |
| Ластаўкі пад стрэхай | 8 |
| Зноўку лёс падставіў мне падножку… | 8 |
| Прысвячаецца Т. | 9 |
| Дзве адзіноты | 10 |
| Запозненае раскаянне | 11 |
| Патаемная надзея | 12 |
| Святло надзеі | 13 |
| Памылкі | 14 |
| Першароднай чысцінёй пялёсткаў белых… | 14 |
| Васковыя сны | 15 |
| Школьны фотаздымак | 16 |
| Таропкая вясна | 17 |
| Сцяжынка ў дзяцінства | 18 |
| Узлёты і падзенні – ўсё адносна | 19 |
| Вясновы холад | 20 |
| Пялёсткавая замець | 21 |

| | |
|---|---|
| Святло бяроз | 22 |
| Прадчуванне восені | 22 |
| Матуліна навука | 23 |
| Маленства бласлаўлёны край… | 24 |
| Дарогі | 25 |
| Хоць усхваляў Бальзак узрост жаночы… | 26 |
| Роздум у дзень нараджэння | 27 |
| Калінавыя пацеркі | 28 |
| На бацькоўскім падворку | 28 |
| Асенні сад | 29 |
| Васільковае поле | 30 |
| У навальніцу | 30 |
| У чаканні зімы | 31 |
| Сябрам | 32 |
| Начныя хвіліны | 32 |
| Вясковыя красуні | 33 |
| Адна ў нас зямля і мова… | 34 |
| Асенні перон | 35 |
| Кожны дзень – маленькае жыццё | 36 |
| Баб’е лета | 37 |

Літаратурна-мастацкае выданне

**Пучык Ніна Венядзіктаўна**

# Маленства
# бласлаўлёны край…

Вершы